


# Краязнаўства на беларускіх землях у перыяд Расійскай імперыі (1772/1795 — 1917 гг.)

## *Развіццё краязнаўчага руху ў 1772/1795 — 1864 гг.*

Вялікую ролю адыграў Даленга-Хадакоўскі ў арганізацыі сеткі карэспандэнтаў па зборы разнастайных матэрыялаў у Беларусі, Польшчы, Расіі і Украіне. Дзякуючы яму некаторыя людзі адчулі інтарэс да краязнаўства і набылі навыкі краязнаўчай працы.

Найбольш вывучаліся землі паўночна-ўсходняй і цэнтральнай Беларусі. Як адбываліся вандроўкі па роднай зямлі, можна ўявіць па апісанні Р.А. Падбярэскага, прысвечанага вядомаму краязнаўцу і пісьменніку Яну Баршчэўскаму: «Трэба ведаць яго асабіста, трэба яго бачыць з кіем паломніка ў руцэ, так як я яго спаткаў у маіх падарожжах, пешшу, сярод беларускага люду, на плытах Дзвіны, у прыдарожных корчмах, на сцежках, ледзь прыметных у лесе, і на вялікіх дарогах». Назіранні і запісы Я. Баршчэўскага ўвайшлі ў «Нарыс паўночнай Беларусі», які ў 1843 г. быў апублікаваны ў «Roczniku Literackim», рэдагаваным Р.А. Падбярэскім. Даследчык падаў шматлікія замалёўкі народнага жыцця: абрады, традыцыі і паводзіны на могілках, вяселлях, гулянках і інш. Баршчэўскі сведчыць, што ў песнях, абрадах, паданнях народа гэтага рэгіёну шмат смутку, адчування цяжкасцяў лёсу і нават роспачы, але, трапна заўважае даследчык, і вясёлыя хвіліны, і практыцызм простых людзей.

Рамуальд Андрэевіч Падбярэзскі (1812 ці 1813 – 1856) паходзіў з незаможнай шляхецкай сям'і, пасля заканчэння Маскоўскага ўніверсітэта працаваў у Маскве і Санкт-Пецярбургу, дзе падтрымліваў сувязі з дэмакратычнымі коламі, але, вярнуўшыся ў Вільню, займаўся літаратурна-выдавецкай дзейнасцю, збіраў беларускі фальклор. Яму належыць этнаграфічны нарыс «Беларускае вяселле» (1848). Высланы за антыўрадавую літаратурную дзейнасць у Архангельскую губерню.

Казімір Андрэевіч Буйніцкі (1788–1878), памешчык, краязнавец, пісьменнік, публіцыст, ганаровы куратар школ Віцебскай губерні. Ён шмат вандраваў па родных мясцінах, апісаў значную колькасць населеных пунктаў Падзвіння, публікаваў артыкулы па пытаннях мясцовай сельскай гаспадаркі. У празаічных і паэтычных творах Буйніцкага адлюстраваныя беларускія сюжэты, узятыя з народных легендаў і паданняў. Быў выдаўцом рэгіянальнага зборніка «Рубон» (1842–1849). Апублікаваў этнаграфічна-краязнаўчы нарыс «Падарожжа па малых дарогах» (у 2-х т., 1841), «Новая вандроўка па малых дарогах» (у 2-х т., 1852).

Памешчык Адам Плятэр (1790–1862) быў адным з першых у плеядзе выдатных даследчыкаў Падзвіння, віцебскага краю. Скончыў Віленскі ўніверсітэт, захапіўся археалогіяй, фальклорам, вывучэннем прыроды. Падарожнічаў па Заходняй Дзвіне. Знайшоў на той час самы доўгі ў Еўропе сашнік. Вывучаў пахаванні ў курганах на славяна-балцкім сумежжы, для чаго выкарыстоўваў сабраныя фальклорныя матэрыялы. Член Кракаўскага навуковага таварыства і Віленскай археалагічнай камісіі.

З роду Плятэраў выйшлі і іншыя краязнаўцы, бо тут ярка праявіліся лепшыя маральныя і інтэлектуальныя рысы шляхецкага саслоўя. Сваячка А. Плятара графіня Эмілія Францаўна Плятэр (1806–1831), больш вядомая як камандзір паўстанцкага атрада ў 1830–1831 гг., стала адной з першых жанчынаў-збіральніцаў народных песень Віцебшчыны. Беларускі этнограф М. Маркс, у доме якога яна часта бывала, ставіў графіню ў першы шэраг культурных дзеячаў нашага народа і лічыў яе прадвесніцай беларускага адраджэння XIX ст. Яна «аддалася ўсёй душой беларускаму люду, ведала яго бяду і спачувала ёй... збірала і спявала яго песенькі, шчодра плаціла за іх дастаўкі і прабавала пяра ў іх наследаванні». На жаль, асабісты архіў, фальклорныя і краязнаўчыя запісы Э. Плятэр не захаваліся. Дарэчы, А. Міцкевіч прысвяціў ёй цудоўны верш «Смерць палкоўніка».

***Валянціна САІТАВА***

***(Працяг будзе)***

***Працяг тэмы. Пачатак у №№ 21–23, 34–36, 42–44 за 2012 год***

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ КИ